УДК 821.161.3-1*А.Сыс:821.161.3-1*А.Мінкін:398.3(=16):7.046(=16)

А. В. БРАДЗІХІНА
(г. Гомель, ГДУ імя Ф. Скарыны)

# СЛАВЯНСКАЯ МІФАЛОГІЯ ЯК НЕАРАМАНТЫЧНЫ СКЛАДНІК ПАЭЗІІ А. СЫСА І А. МІНКІНА

*У артыкуле на матэрыяле лірыкі А. Сыса і А. Мінкіна асэнсоўваюцца адметнасці выкарыстання славянскіх міфалагічных вобразаў, іх функцыі і месца ў мастацкай сістэме паэтаў. Аўтар падкрэслівае агульнае і адметнае ў вершах творцаў на міфалагічнай аснове, арыентуючыся на адметнасці іх светаўспрымання, мадальнасць эстэтычнай свядомасці, наследаванне пэўнай традыцыі, погляды на прызначэнне паэзіі і канкрэтныя мастацкія падыходы да ўвасаблення вобразаў і матываў народнай міфалогіі.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Міфалагічнае светаадчуванне нашых продкаў грунтавалася на непасрэднай наіўнасці, веры ў адухоўленасць сусвету, гарманічным суіснаванні ў ім жывога і нежывога пачаткаў, амбівалентнасці, магчымасці пераўтварэнняў. Цікавасць да язычніцкай свядомасці, асэнсавання вытокаў духоўнай культуры беларусаў звязваецца найперш з творчасцю сучасных неарамантыкаў, хаця ў апошнія дзесяцігоддзі фальклорна-міфалагічныя матывы паслядоўна ўжываюцца творцамі самых розных мастацка-эстэтычных арыентацый: Р. Барадулінам, Я. Сіпаковым, А. Разанавым, А. Мінкіным, А. Сысам, В. Шніпам, А. Дэбішам, М. Скоблам, В. Куртаніч, З. Дудзюк, А. Данільчык, Г. Дубянецкай, Г. Булыка, А. Спрынчан, Л. Рублеўскай і многімі іншымі паэтамі. У. Конан, аналізуючы міфапаэтычны патэнцыял сучаснай паэзіі, слушна заўважае: “Неарамантызм выявіўся не толькі ў традыцыйнай для беларускай літаратуры песеннай лірыцы, але і ў яе мадэрнісцкіх і авангардысцкіх плынях. І не толькі ў творчасці яе лідараў, але і ў агульным літаратурным працэсе” [1, с. 202].

Пры гэтым кожны з аўтараў кіруецца адметнай матывацыяй і, адпаведна, прынцыпамі паэтычнага ўвасаблення згаданых матываў ва ўласнай вершатворчасці. Так, з’яўленне нізкі міфалагічнага характару ў паэзіі А. Глобуса (вершы “Кветка”, “Варона”, “Валун”, “Нараджэнне” і інш.) крытыкі адзінадушна і небеспадстаўна абвясцілі данінай модзе, бо сэнсава-сімвалічны поліфанізм у ёй звужаецца да дэкаратыўнай функцыі. У паэзіі А. Разанава (творы “Гліна”, “Змеі”, “Танец з вужакамі”, “Відушчы камень” і інш.), у адпаведнасці з асаблівасцямі мастацкага мыслення і светаўспрымання аўтара, міфалагізм выступае катэгорыяй філасофскай, праз яго глыбока асэнсоўваюцца сутнасныя анталагічныя і антрапалагічныя праблемы. У артыкуле мы паспрабуем вызначыць адметнасці мастацкіх падыходаў А. Сыса і А. Мінкіна да выкарыстання славянскай міфалогіі, акрэсліць агульнае і адрознае ў яе творчым пераасэнсаванні і ўвасабленні згаданымі паэтамі.

Абодва творцы маюць неарамантычнае светаўспрыманне, чым, відавочна, абумоўлены іх паслядоўны зварот да вобразаў і матываў беларускай міфалогіі. Тым не менш функцыі міфалагем, модус мастацкасці лірыкі А. Сыса і А. Мінкіна, іх погляды на прызначэнне паэзіі катэгарычна адрозніваюцца. Нягледзячы на вядомае правакатыўна-смелае выказванне А. Сыса пра тое, што ён сын Купалы і брат Багдановіча, усё ж такі ў засваенні беларускай міфалогіі ён бліжэй да традыцый першага, у той час як у А. Мінкіна больш выразна адчуваецца ўплыў другога.

Выкарыстанне беларускай міфалогіі ў паэзіі А. Мінкіна (кнігі “Сурма”, 1985; “Расколіна”, 1991; “Пенаты”, 2007) найперш падпарадкавана асветніцкай і эстэтычнай функцыям. Як і яго славуты папярэднік у сваёй нізцы “У зачараваным царстве”, сучасны творца знаёміць чытача з таямнічай, загадкавай, містычнай Беларуссю праз густоўнае апісанне яе міфалагічных істот, не ставячы перад паэзіяй практычных задач,

прытрымліваючыся прынцыпу “чыстай красы”. Такім, да прыкладу, уяўляецца верш А. Мінкіна “Хохлік” з яго тонкай, як у М. Багдановіча, гукавой арганізацыяй, што надае радкам падкрэсленую музычнасць:

Калі прачнемся мы, калі мы
Убачым снежныя кілімы,
Што ноч паслала за вакном –
На сэрцы радасць заіскрыцца
І на старой хрыпатай скрыпцы
Зайграе раптам хохлік-гном.

Каваў ён пад зямлёй чырвонцы,
Забыўшы скрыпку, гульні, сонца
І радасць, што звініць званком,
Ды вось раздаў свой скарб сарокам,
На чысты вылез снег са змроку
І грае, грае за вакном [2, с. 36].

У меншай ступені міфалагемы ў лірыцы паэта служаць адлюстраванню праблем сучаснасці, утрымліваюць адкрыты ці прыхаваны алегарычны сэнс, што, аднак, не спрыяе павышэнню мастацкіх вартасцей твора. Так, верш “Вадзянік” пачынаецца, як і аднайменны твор М. Багдановіча, элегічна-журботнай карцінай сузірання нерухомага, павольнага, “аблутанага” цінай старога вадзяніка, які, аднак, замест “адвечнага сну” разважае пра экалагічныя праблемы. З дапамогай міфапаэтычных вобразаў у наступных радках верша амаль публіцыстычнымі інтанацыямі супрацьпастаўляюцца натуральная, першародная чысціня прыроднага свету і катастрафічны стан прыроды сёння:

А зараз няма таго смаку ў вадзе,
І рэчка змялела, і гай парадзеў,
Засыпаў бульдозер лагчыны, раўкі,
Абрынуўся бераг высокі ракі,
І дзеўкі-русалкі ад бруднай вады
Даўно паўцякалі, сплылі хто-куды [2, с. 24].

Сярод шматлікіх вобразаў беларускай, і шырэй – славянскай, міфалогіі цэнтральнае месца ў паэзіі А. Мінкіна займае Белабог (вершы “Белабог”, “Пасланец Белабога”, лірычныя празаічныя тэксты “Апокрыф”, “Апошняя казань Белабога”). У адпаведнасці з народнымі ўяўленнямі, гэтая істота ўвасабляе светлы пачатак, становіцца сімвалам дабра, шчасця і выратавання чалавецтва. У вершах А. Мінкіна Белабог, які, па сутнасці, адначасова паўтарае шлях Хрыста і Праметэя (“…на крыж шасціканцовы // Лісліўцы Белабога прыбівалі, Як два арлы кружлялі над распнутым – // Сівы арол – глюгасты і зайздросны, // І двухгаловы – удвая драпежней” [2, с. 39]), непасрэдным чынам звязваецца з нацыянальна-адраджэнскімі праблемамі, будучым Беларусі, духоўна-маральным станам суайчыннікаў. Недарэмна, думаецца, паэтам абраны менавіта гэты міфлагічны вобраз, праз які транслююцца ўказаныя вышэй канатацыі, бо імя бога сугучнае назве нашай нацыі. Важнасць вобраза Белабога ў мастацка-эстэтычнай сістэме паэта падкрэсліваецца і частотнасцю зваротаў, і паслядоўным напісаннем займенніка Яго з вялікай літары, і ўзвышана-малітоўным стылем прысвечаных Яму тэкстаў, арганізаваных з дапамогай спалучэння полісіндэтона і анафары: “І ён прыстаў. Сеў на камень пляскаты. // І рукі сашчапіў. І змружыў вочы…” [2, с. 39].

Засяляючы свой мастацкі свет язычніцкімі істотамі, А. Мінкін імкнецца стварыць і ўласна аўтарскую (містыфікавана міфалагічную) прастору. Гэта рака Нівеч з яе цёмнай вадой, якая выразна адлюстроўвае трагічную эстэтычную мадальнасць такіх вершаў, бо, па словах В. Шынкарэнка, яна “кожнаму абяцае супакаенне і бясследна паглынае ўсё” [3, с. 128]. Менавіта гэты вобраз у лірыцы паэта ўвасабляе патубаковы свет і ўяўляецца ўладаннямі Чарнабога – сімвала смерці, знікнення, цемры, бяспамяцтва: “Ды не май



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

зайздрасці да лёгкасці й весялосці тых, каго вілаводныя чарнабожычы вядуць шляхам да Нівечы. Кажу табе: хто не ведае сваіх каранёў, той лягчэйшы за адорвеня-лістка, цягнёнага ветрам да хуткай згубы!” [2, с. 137–138] (“Апошняя казань Белабога”).

Калі ў творчасці А. Мінкіна заўважаецца выразная арыентацыя на традыцыі М. Багдановіча, то лірыка з міфалагічнымі матывамі А. Сыса (зборнікі “Агмень”, 1988; “Пан Лес”, 1989; “Сыс”, 2002), як было зазначана вышэй, відавочна, ствараласяпад уплывам ранняга Купалы. Багдановічская канцэпцыя паэзіі “чыстай красы” не адпавядае мастацкім задачам А. Сыса. Яго лірычны герой упэўнены:

Паэт не мае права быць паэтам
цнатлівае і чыстае красы,
калі ў Айчыне загніваюць рэкі
і засыхаюць на вачох лясы [4, с. 185].

Важнасць гэтай часткі спадчыны паэта слушна акрэсліў І. Штэйнер: “Паэт перш за ўсё вярнуў у беларускую культурную традыцыю міфалагічнае ўспрыняцце свету, страчанае не толькі намі, але і ўсімі славянамі” [5, с. 282]. Як і ў А. Мінкіна, у А. Сыса заўважаецца цесная знітаванасць міфалагічнага і нацыянальна-патрыятычнага пачатку, аднак з публіцыстычнай дамінантай яго выяўлення, што падкрэслівае рамантычна-бунтарскую скіраванасць вершатворчасці паэта і пасіянарнасць яго лірычнага героя, які пры любых, нават самых складаных, абставінах і паваротах лёсу “ікламі ўгрызаўся ў лёд” [6, с. 57] (верш “Вяпрук”).

Нельга не адзначыць і прытчавасць вершаў А. Сыса з міфалагічнымі матывамі. Такія творы яднаюць дыдактычнасць з алегарычнасцю і маюць складаную сімволіку, заснаваную на спалучэнні традыцыйнага вытлумачэння і арыгінальна-аўтарскага сэнсавага напаўнення вобразаў:

Мае згрызоты збіваюцца ў клубкі як вужакі
і я – уладар гэнага паганага кодлішча –
бы цмок па адной вышмыргваю вужак з клубка…
<…>
раніца сонцам і святлом змывае з мяне
гадаў бруд і я бягу і шукаю людзей і тлумачу
што вужакі добрыя і разумныя істоткі… [4, с. 187].
(“Вужака”)

Лірычны герой такіх лірычных тэкстаў здольны да пераўтварэння ў іншых істот і нават нематэрыяльныя існасці (вершы “Воўк”, “Вужака”, “Вяпрук”, “Змяіны цар” і інш.), захоўваючы пры гэтым рысы аўтапсіхалагічнага суб’екта. Тым самым ён становіцца натуральнай і арганічнай часткай таго міфалагічнага свету, які ствараецца ў вершах паэта. Самымі папулярнымі вынікамі чалавечых трансфармацый у А. Сыса з’яўляюцца вобразы вужынага караля і ваўка, на падставе якіх паэт будуе і арыгінальна-аўтарскую міфалогію, як, да прыкладу, у вершы “Бажавоўк”:

І ўратаваны, з неба Дух
зноў сыдзе чалавекам,
зноў будзе жыць сярод падлюг
ды іх марыянетак.

Ён бажавоўкам праслыве,
прыблудным патарочам,
ніхто яго не праміне,
не плюнуць каб у вочы [6, с. 50].

З аднаго боку, тут відавочныя алюзіі на біблейска-хрысціянскую міфалогію, з другога – у сысаўскім арыгінальным вобразе нельга не заўважыць адсылку да вобраза ваўкалака – адной з самых трагічных істот беларускага міфалагічнага пантэона, адрынутай як светам жывёльным, так і чалавечым. Гэта, у разуменні нашых продкаў, найбольш яскравае ўвасабленне татальнай і вечнай адзіноты, што ў спалучэнні з сакралізацыяй вобраза, пазначанай паэтам ужо на ўзроўні намінацыі (бажавоўк), спараджае свежы і кранальны вобраз.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Схільнасць да стварэння ўласных міфалагем на славянскім падмурку ўласціва і А. Мінкіну. Парадаксальна, але ў вобразе яго "закаханага ў зоркі" [7, с. 47] чалавекаптаха ("Балада пра чалавекаптаха"), створанага, відавочна, пад уплывам розных культурных традыцый, таксама больш выразна пазнаецца сімволіка беларускага ваўкалака, чым антычнага Ікара ці хрысціянскага анёла. Гэта маргінальная істота, не прынятая і не зразуметая насельнікамі акаляючага свету, асуджаная на адзіноту, нягледзячы на яе высакародныя памкненні:

Нехта ўсімі забыты
цягнуў па бруку крылаў ашмоцце
і праклінаў жалезабетонныя пліты
і задыхаўся ў бензінавым смуродзе.

А мерцвякі закутыя ў бляшанкі
як жамяра ў бурштын
праносіліся ля яго маланкай
слухаючы сімфонію шын [7, с. 47].

Такім чынам, зварот А. Сыса і А. Мінкіна да славянскай міфалогіі дэтэрмінаваны пошукам асноў беларускай духоўнасці, імкненнем да спасціжэння сутнасных асноў быцця і шляхоў да адраджэння-выратавання нацыі. Асаблівасцю лірыкі абодвух аўтараў з'яўляецца і спалучэнне элементаў язычніцкай і хрысціянскай веры ў прасторавым полі аднаго верша, схільнасць да стварэння ўласных міфалагем на славянскім падмурку і неарамантычнае светаадчуванне. Катэгарычныя адрозненні ў мастацкім выкарыстанні міфалагем абумоўлены мастацка-эстэтычнымі арыентацыямі: на Я. Купалу ў А. Сыса і на М. Багдановіча – у А. Мінкіна.

**Спіс літаратуры**

1 Конан, У. У пошуку страчанага раю (Міфалагічныя і біблейскія матывы ў літаратуры XX стагоддзя) / У. Конан // Полымя. – 2004. – № 4. – С. 190–206.
2 Мінкін, А. Пенаты : паэзія / А. Мінкін. – Мінск : І. П. Логвінаў, 2007. – 146 с.
3 Шынкарэнка, В. З верай у чалавечнасць: адметнасці вобразна-паэтычнай сістэмы сучаснай беларускай літаратуры / В. Шынкарэнка. – Гомель : РНПУП "РАТОН", 2001. – 200 с.
4 Сыс, А. Лён : выбраныя творы / А. Сыс. – Мінск : Кнігазбор, 2006. – 436 с.
5 Штэйнер, І. Дняпроўскія матывы / І. Штэйнер. – Гомель : Сож, 2009. – 368 с.
6 Сыс, А. Сы с: вершы / А. Сыс. – Мінск : Маст. літ., 2002. – 159 с.
7 Мінкін, А. Расколіна : вершы і паэма / А. Мінкін. – Мінск : Маст. літ., 1991. – 77 с.

УДК 821.161.3-31*В.Бечык

А. Ф. БЯРОЗКА
(г. Гомель, ГДУ імя Ф. Скарыны)

## ДЗЁННІК ВАРЛЕНА БЕЧЫКА: АСАБЛІВАСЦІ ПАЭТЫКІ

*На матэрыяле дзённіка В. Бечыка ў артыкуле разглядаецца жыццёвы і творчы шлях крытыка. Асаблівая ўвага надаецца разгляду сістэмы светапогляду аўтара, якая сфармавалася ў яго ў прадчуванні блізкасці ўласнай смерці.*

Дзённік В. Бечык пачынае весці з 1959 года. У гэты час дваццацігадовы малады чалавек толькі скончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт і пачаў працу выкладчыкам



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ